Наш край у другой палове 1940-х — пачатку 1990-х гг.

1. Работа ў міні-групах. Выкарыстоўваючы матэрыял вучэбнага дапаможніка і гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» вашага раёна, вызначце:

А. У склад якіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак уваходзіў ваш населены пункт у 1945–1991 гг.; як змяняўся яго статус?

Б. Якія прамысловыя або сельскагаспадарчыя прадпрыемствы працавалі ў вашай мясцовасці ў 1945–1991 гг.?

В. Якія гістарычныя падзеі 1945–1991 гг. закранулі жыхароў вашага населенага пункта, раёна? Якім чынам?

Прадстаўце вынікі сваёй працы класу, параўнайце з вынікамі іншых міні-груп. Падрыхтуйце агульную прэзентацыю «Мая малая радзіма ў 1945–1991 гг.». Параўнайце яе з прэзентацыямі «Мая малая радзіма ў XIX — пачатку XX ст.» і «Мая малая радзіма ў 1917–1945 гг.», зрабіце вывад пра развіццё сваёй мясцовасці ў другой палове XX ст.

2. Экскурсія па родным краі. Складзіце каталог помнікаў гісторыі, культуры і прыроды вашай мясцовасці, заснаваных у другой палове XX ст. На аснове каталога распрацуйце план экскурсіі па сваім родным краі (населеным пункце) «Мой край — часцінка Савецкай Беларусі».

3. Славутыя землякі. З дапамогай матэрыялаў гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» і дадатковых крыніц інфармацыі даведайцеся, жыццё і / або дзейнасць якіх славутых людзей звязаныя з вашай мясцовасцю ў другой палове XX ст.

Даведайцеся, хто з вашых землякоў удзельнічаў у гістарычных падзеях 1945–1991 гг., напрыклад, быў удзельнікам вайны ў Афганістане (1979–1989 гг.) або ліквідатарам аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Прадстаўце вынік свайго даследавання ў выглядзе артыкула ў сродках масавай інфармацыі ў рубрыцы «Нашы землякі» або паста ў сацыяльнай сетцы.

4. Мая сям'я. Даведайцеся пра гісторыю сваёй сям'і ў 1945–1991 гг.: дзе жылі і чым займаліся вашы прабабулі і прадзядулі, бабулі і дзядулі, які ўдзел яны бралі ў гістарычных падзеях. Знайдзіце ў сямейных фотаальбомах здымкі, якія могуць распавесці гісторыю вашай сям'і ў кантэксце гісторыі краіны ў другой палове XX ст., а таксама рэчы (кнігі, цацкі і інш.).

Падрыхтуйце міні-выставу «Гісторыя маёй сям'і — гісторыя маёй краіны». Правядзіце экскурсію для аднакласнікаў.